# Я ГЭТУЮ ЗЯМЛЮ РАДЗІМАЙ НАЗЫВАЮ…

**ЗЭЛЬВА. Напярэдадні Сусветнага дня паэзіі ў Зэльвенскай раённай бібліятэцы выступілі госці са Слоніма, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы Ірына Войтка і Надзея Салейка.**

Нагадаем, што слонімскія паэтэсы прадстаўляюць не толькі рэспубліканскую пісьменніцкую арганізацыю, але і Слонімскае раённае літаратурнае аб’яднанне імя Анатоля Іверса (кіраўнік І. А. Войтка). А яшчэ Ірыне Антонаўне і Надзеі Пятроўне было наканавана нарадзіцца ў Зэльвенскім краі. Таму напярэдадні свайго свята творцы завіталі ў госці да землякоў.



Да Сусветнага дня паэзіі ў Зэльвенскай раённай бібліятэцы было прымеркавана сумеснае пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні «Ліра» і літаратурнага клуба «Малюся слову» (пры Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Кіраўнік клуба Яніна Шматко; вядучая мерапрыемства Наталля Цынс). Сустрэча з паэтэсамі атрымала красамоўную назву «Я гэтую зямлю Радзімай называю». Малая радзіма... Якую разнастайнасць шчырых, глыбокіх пачуццяў і яркіх эмоцый выклікае яе вобраз! З якім душэўным трапятаннем праходзіць у чалавека кожнае наведванне гэтай зямлі! Каб у поўнай меры перадаць усю гэтую багатую палітру – адчуванне радаснага палёту душы і шчымлівага суму – неабходна заклікаць на дапамогу паэтычнае слова.

Паэтэсы распавядалі пра тое, як паэзія ўвайшла ў іх жыццё, якія паэты сустрэліся на іх літаратурным шляху і далі ў свой час слушныя парады; пра тое, ці лёгка напісаць і выдаць кнігу паэзіі ў наш час, і пра многае іншае.

Надзея Салейка прачытала свае вершы на грамадзянскую і гумарыстычную тэматыку, а таксама падарыла ўдзячным слухачам некалькі песень у аўтарскім выкананні. Ірына Войтка прадэкламавала свае новыя вершы пра Зэльву, пра родныя і мілыя сэрцу краявіды малой радзімы, а таксама лірычныя прысвячэнні родным людзям, шчырыя прызнанні ў любові да паэтычнага беларускага слова. Зэльвенцы з задавальненнем паслухалі ў запісы песню «Роднае

слова» на верш Ірыны Войткі (музыка Валерыя Шмата) у выкананні арт-групы «Беларусы». Сустрэча прайшла вельмі змястоўна і па-зямляцку цёпла. Патрыятычныя інтанацыі пераважалі фактычна ў кожным эпізодзе мерапрыемства. У ходзе яго было неаднаразова падкрэслена, што мастацтва слова і любоў да Радзімы цесна ўзаемазвязаны.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** напярэдадні Сусветнага дня паэзіі ў Зэльве выступілі госці са Слоніма, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэсы Ірына Войтка і Надзея Салейка. Зэльвенская раённая бібліятэка. Сакавік 2025 года.




Надзея Салейка







